# Кіраўніцтва карыстальніка BY
# Бартавая прылада

BY RU PL EN www.beltoll.by

## Увага

**Бартавая прылада патрабуецца для збору электронных плацяжоў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.**

**Бартавая прылада не можа быць перанесена на іншы транспартны сродак!**




## Камплект пастаўкі

Пераканайцеся, што Вы атрымалі усе дэталі, пералічаныя ў прыведзеным ніжэй спісе пастаўкі, і што яны не маюць прыкмет пашкоджання:

- бартавая прылада
- кранштэйн
- кіраўніцтва карыстальніка
- сурвэтка для ачысткі шкла

## Тэхнічныя дадзеныя

Тэмпература навакольнага асяроддзя пры эксплуатацыі прылады: -25 °C ... 85 °C.

Адносная вільготнасць паветра пры эксплуатацыі прылады: не больш за 90 % (пры T=40 °C).

Бартавая прылада не патрабуе тэхнічнага абслугоўвання!

Усе правы абароненыя.
© Kapsch TrafficCom AG.

1

Распакуйце бартавую прыладу, кранштэйн і сурвэтку для ачысткі шкла.

2



Прымацуйце кранштэйн да бартавой прылады, усунуўшы яго ў прызначанае для гэтага гняздо.

3



Размясціце бартавую прыладу гарызантальна кранштэйнам да ветравога шкла.

4



Абярыце месца для бартавой прылады ў верхняй частцы ветравога шкла, не здымаючы ахоўнай плёнкі з клейкага пакрыцця кранштэйна. Пераканайцеся, што прылада добра размяшчаецца ў абраным месцы і не змяншае агляднасць ветравога шкла для кіроўцы. Калі ветравое шкло мае металізаванае пакрыццё (напрыклад, экран, што адлюстроўвае сонечная святло), памятайце, што за люстэркам задняга віду альбо пад ім знаходзіцца зона без металізаванага пакрыцця (пракансультуйцеся з прадаўцом).

5



Ачысціце ветравое шкло ў месцы прымацавання кранштэйна з дапамогай спецыяльнай сурвэткі для ачысткі шкла. Пераканайцеся, што ветравое шкло сухое, а яго тэмпература не меншая за 15°C. Калі неабходна, прасушыце шкло з дапамогай сухой тканіны альбо сагрэйце і высушыце яго з дапамогай паветранага абагравальніка шкла.

6



Здыміце ахоўную плёнку з клейкага пакрыцця кранштэйна.

7



Пераканайцеся, што бартавая прылада размешчана гарызантальна. Акуратна ўсталюйце бартавую прыладу ў гарызантальным становішчы на ачышчанай часці паверхні ветравога шкла і моцна прыцісніце яго не менш чым на 10 секунд. Не здымайце бартавую прыладу з кранштэйна на працягу 24 гадзін.

## Выкарыстанне

Эксплуатацыя бартавой прылады на платных дарогах: пры праходжанні станцыі аплаты гучаць наступныя акустычныя сігналы:

| | |
|---|---|
| **1 сігнал** | транзакцыя выканана паспяхова |
| **2 сігналы** | транзакцыя выканана паспяхова, але акумулятар зараджаны недастаткова, ці баланс рахунку бартавой прылады амаль выдаткаваны / нізкі. Накіроўвайцеся да пункту распаўсюджвання. У выпадку калі баланс бартавой прылады нізкі ці скончыўся (толькі для рахункаў з папярэдняй аплатай), неабходна папоўніць рахунак. |
| **4 сігналы** | транзакцыя НЕ выканана. Едзьце да пункту распаўсюджвання |
| **няма сігналу** | транзакцыя НЕ выканана. Едзьце да пункту распаўсюджвання |

## Агульная інфармацыя

Бартавая прылада выкарыстоўваецца для збору плацяжоў за адлегласць паездкі па тэрыторыі Рэспублікі Беларусь тых транспартных сродкаў, якія падлягаюць спагнанню аплаты.

Спагнанне аплаты за адлегласць робіцца ў адпаведнасці з дзеючымі законамі і правіламі Рэспублікі Беларусь.

Бартавая прылада для збору электронных плацяжоў праце на паласе частот згодна з рэкамендацыяй ERC/REC 70-03, дадатак 5, групы A і B.

Бартавая прылада не з'яўляецца ўласнасцю кіроўцы транспартнага сродку, але перадаецца яму/ёй выключна для выкарыстання электроннай сістэмы спагнання аплаты на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Напрыканцы тэрміну выкарыстання бартавую прыладу неабходна вярнуць на пункт распаўсюджвання.

Катэгарычна забараняецца адкрываць корпус бартавой прылады! Любыя несанкцыяваныя дзеянні з прыладай (напрыклад, капіраванне тэхналогіі) забароненыя.

Бартавая прылада адпавядае нарматыву R&TTE 1999.

Больш інфармацыі даступна на www.beltoll.by

30029450000